# Экалагічныя веды – стрыжань сістэмы маральнага выхавання

Актуальнасць экалагічнага выхавання падрастаючага пакалення ў сучасным свеце агульнапрызнана. Абвастрэнне экалагічных праблем, што прыводзіць да пагаршэння жыцця і здароўя людзей, звязваецца сёння з узкікненнем адчужанасці паміж чалавекам і навакольнай прыродай, адсутнасцю ў люд-зей адпаведнага ўзроўню экалагічнай свядомасці.

У апошнія гады дзейнасць Слуцкай гарадской дзіцячай бібліятэкі ў сферы экалагічнага інфармавання дзяцей і падлеткаў прымае ўсё больш сістэмны і комплексны характар. Сёння для ўсіх нас відавочна, што экалагічныя веды з'яўляюцца стрыжнем усей сістэмы маральнага выхавання. Адгэтуль адна з галоўных задач — фарміраваць і ўмацоўваць духоўнасць дзяцей і падлеткаў, сфарміраваць у іх добрыя адносівы да прыроды і пачуццё асабістай адказнасці за ўсё жывое.

Экалагічная асвета бібліятэчнымі сродкамі мае сваю гісторыю і свае тэхналогіі. Бібліятэка — гэта накапленне інфармацыйных рэсурсаў, стварэнне даведачна-інфармацыйнай базы, вядзенне спецыялізаваных картатэк, розныя формы індывідуальнай і масавай работы. У сучаснай Еўропе экалагічны стыль жыцця модны. Мы стараемся ўвесці гэтую моду і ў нашай бібліятэцы пры арганізацыі працоўнай прасторы,ператварыць яе ў экасістэму. Пільную ўвагу ўдзяляем зберажэнню кніжнага фонду: пры бібліятэцы створана «зялёная бальніца» «Флорык», дзе кнігі своечасова рамантуюцца. Так зберагаюцца не толькі дзяржаўныя грошы, але і гектары леса ад высякання. Маленькія чытачы дапамагаюць суседзям і родным пазбавіцца ад непатрэбнай літаратуры, прыносячы яе ў бібліятэку. Частку кніг мы пакідаем у фондзе, а непатрэбныя здаём у макулатуру. Тры гады запар у верасні бібліятэка ўдзельнічае ў сусветнай акцыі «Ачысцім планету ад смецця»: дзеці ператвараюць непатрэбныя лісткі паперы — у арыгамі і выцінанкі; пластыкавыя бутэлькі з-пад вады — у арыгінальныя сувеніры; сучкі, травінкі — у маляўнічыя кампазіцыі. Гэтыя работы спачатку знаходзяць свае месца на бібліятэчных выставах — «Арыгамі сваімі рукамін, «Саломка-чараўніца», «Свет размалюю фарбамі яркімі», «Нетрадыцыйная навагодняя ёлка», а потым становяцца падарункамі.

Бібліятэчную прастору арганізуем так, каб юныя наведвальнікі адчувалі сябе як дома. Выяўляем і сістэматызуем бібліятэчны фонд экалагічнай накіраванасці. Бібліятэка налічвае больш за 3000 экзэмпляраў друкаваных крыніц інфармацыі, што нясуць у сабе экалагічныя веды. Прыродазнаўчая літаратура складае 4 % ад агульнага кніжнага фонду. І гэта не ўлічваючы мастацкай літаратуры, старонкі якой апісваюць прыгажосць і хараство прыроды, прывіваюць любоў да роднага краю. Акрамя таго, штогод бібліятэка падпісваецца на 12 расійскіх і беларускіх прыродазнаўчых часопісаў і газет. Звяртаем увагу на набліжэнне экалагічнага фонда да чытача. Гэтаму садзейнічае выставачна-аглядная дзейнасць бібліятэкі. У экалагічным кутку «Зялёная палянка» і эколага-асветніцкім цэнтры «Зямлянам — чыстую планету» сабраны дзіцячыя кнігі прыродаахоўнага зместу і навукова-папулярная літаратура для дзяцей і падлеткаў па экалогіі, энцыклапедыі, перыядычныя экалагічныя выданні, тэматычныя папкі, карціны і малюнкі мастакоў-случчан і працы навучэнцаў гарадской мастацкай школы, тэхнічны комплекс (тэлевізар, відэамагнітафон, відэа- і аўдыятэка экалагічнага зместу, камп'ютэр з электронным каталогам). Афармляючы выставы для дзяцей, улічваем узроставую псіхалогію дзяцей і, найперш, іх памкненне да новых уражанняў. Таму акрамя разнастайнай літаратуры на выставах абавязкова размяшчаюцца розныя вырабы, цацкі, макеты. Так, выстава-кастрой «Навагоднія цуды» акрамя літаратуры ўтрымлівала зробленыя сваімі рукамі ёлачныя ўпрыгажэнні з падручных матэрыялаў, карнавальныя маскі, сняжынкі-выцінанкі, якія прадстаўлялі сабой раслінны і жывёльны свет Беларусі. А экслазіцыя аднаго часопіса «У гасцях у "Лесавіка"» дэманстравала вырабы з прыродных матэрыялаў, зробленыя рукамі дзяцей. Спецыялізаваная выстава «Красуй, мой горад, сёння і заўсёды» была прымеркавана да рэспубліканскіх «Дажынак» у Слуцку. У

бібліятэцы быў аформлены разгорнуты кніжны прагляд «Горад майго дзяцінства», раздзелы якога змяшчалі пейзажныя замалёўкі і пано з пры-родных матэрыялаў з відамі сучаснага абноўленага горада ў розныя поры года. Прыродазнаўчая экспазіцыя «Мой родны кут, што Случчынай названы» выстаўлялася на абласной духоўна-асветніцкай праграме «Сям'я — яднанне і любоў», якая 8-10 чэрвеня 2007 года прайшла ў Слуцку. Увазе юных жыхароў горада і раёна і іх бацькоў у гэтыя дні былі прадстаўлены кніжныя выставы і прагляды літаратуры «Насустрач дзіцячым сэрцам», «Быць здаровым — здорава».

У нашай бібліятэцы ёсць усе магчымасці для навуковага вывучэння запытаў дзяцей і падлеткаў па экалагічнай тэматыцы, праблем чытання прыродазнаўчай літаратуры, асвятлення гэтай тэматыкі на старонках дзіцячага друку (бібліятэка выпісвае 92



перыядычныя выданні). У бібліятэцы праводзілася даследаванне, мэтай якога было даведацца, наколькі наш кніжны фонд экалагічнай тэматыкі адпавядае запытам чытачоў і ці маюць самі чытачы патрэбу і схільнасць да чытання прыродазнаўчай літаратуры. Паралельна вялося вывучэнне выкарыстання кніжнага фонду (Раздзел 28 «Біялагічныя навукі (навукі аб жывой прыродзе)») на абанеменце 5-9 класаў. У анкеце змяшчаліся 4 пытанні, якія тычыліся чытацкай цікаўнасці ў сферы экалагічкай літаратуры.

На пытанне: «З якой мэтай вы звяртаецеся да экалагічнай літаратуры?» — рэспандэнты адказалі наступным чынам:

- дадатковая літаратура ў дапамогу школьным прадметам — 48 %;
- асабістая зацікаўлекасць — 29 %;
-для пашырэння кругагляду — 21 %;
- іншае — 2 %.

Аналіз адказаў на пытанне «Якая тэма ў раздзеле "Экалогія" найбольш вас цікавіць?» паказаў, што школьнікі цікавяцца пытанкямі аховы навакольнага асяроддзя, утрымання хатніх жывёл і энергазберажэння.

На нытанне: «Ці адпавядае фонд экалагічнай літаратуры нашай бібліятэкі вашым запытанням?» — усе рэспандэнты (100 %) адказалі станоўча.

86 % рэспандэнтаў з ліку малодшых школьнікаў і 48 % дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту звяртаюцца да прыродазнаўчых і экалагічных часопісаў. Найбольш папулярныя ў дзяцей часопісы «Филя», «Друг", «Юный натуралист», «Лесавік», «Муравейник», "Родная пры-рода», «В мире растений», «В мире животных».

Зоны рэлаксацыі ў бібліятэцы ўяўляюць сабой зялёную горку, зімовы сад, гульнёва-забаўляльны гарадок — месца для адпачынку дзяцей, самастойных гульняў, назіранкяў за хатнімі кветкамі, самастойвага чытання.

Зона калекцыі «Творчая лабараторыя прыроды» ўтрымлівае стэлажы з выставамі дзіцячых малюнкаў на прыродазнаўчыя тэмы, экспазіцыю «Цудоўнае сваімі рукамі» з вырабамі дзяцей з прыродных матэрыялаў, гербарыіраслік і калекцыі насякомых.

Летась пры бібліятэцы створана інфармацыйна-экалагічнае агенцтва «Экамікрафон», разлічанае на шырокае ікфармаванне насельніцтва аб дзейнасці бібліятэкі па папулярызацыі экалагічнай літаратуры для дзяцей і падлеткаў. Усе гэтыя структурныя падраздзелы функцыянуюць згадна доўгатэрміновай матавай канцэпцыі экалагічнай асветы «Жыві, прырода!», якая рэалізуецца з 2000 года.

Экалагічная студыя "Вернісаж" у адчыніла свае дзверы для наведвальнікаў у маі 1993 года і першапачаткова была творчай майстэрняй для вучняў пачатковых класаў па стварэнні з прыродных матэрыялаў мастацкіх вырабаў. Але дзеці хацелі ведаць пра расліны, з якімі ім прыходзіцца працаваць. Бываючы ў гарадскім парку пад час збору прыроднай сыравіны, дзеці вучыліся распазнаваць птушыныя галасы, цікавіліся насякомымі, якія насялялі гэты экалагічны куток. Да таго ж дзіцячы арганізм патрабаваў гульняў у перапынках паміж сядзеннем за студыйнымі сталамі. Таму хутка для знаёмства з экалагічнымі азамі ўзнікла секцыя «Аз і букі экалагічнай навукі». Ішоў час. Дзеці хутка выраслі з рамак аб'яднання, і, каб затрымаць іх у студыі, патрэбна было шукаць нейкія новыя формы работы. Улічваючы тое, што многія студыйцы наведвалі гурткі Дома творчасці, музычную і мастацкую школы горада, з'явілася задумка арганізаваць экалагічную гасцёўню «Саюз прыроды і мастацтва», дзе стуцыйцы маглі б праявіць свае таленты,

сустракацца з паэтамі і пісьменнікамі, іншымі цікавымі людзьмі. У 2006 годзе адбылося яшчэ адно адгалінаванне — утварылася секцыя «Экаэтыка» для дзяцей, якія ўсур'ёз цікавяцца экалагічнымі праблемамі, думаюць у будучым звязаць сваё жыццё з прыродазнаўчымі навукамі. Такім чынам, работа ў экалагічнай студыі «Вернісаж» вядзецца комплексна і разлічана на розныя катэгорыі карыстальнікаў, улічваючы ўзроставыя асаблівасці і інтарэсы дзяцей. У сваёй дзейнасці студыя выкарыстоўвае як традыцыйныя формы і метады, так і інавацыйныя.

Для паспяховай і плённай дзейнасці студыі, развіцця чытацкіх інтарэсаў, творчых здольнасцей дзяцей у экалагічным накірунку ў Слуцкай гарадской дзіцячай бібліятэцы ёсць неабходныя ўмовы і рэсурсы:

- у горадзе ёсць чытацкая група, якая арыентавана на чытанне экалагічнай літаратуры: вучні і настаўнікі 12-ці агульнаадукацыйных школ, школы-інтэрната для дзяцей-сірот, Цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і раз-віцця дзяцей і падлеткаў, наведвальнікі 18-ці дзіцячых дашкольных устаноў, бацькі;

- пры бібліятэцы створаны і прачуе літаратурна-музычны салон «Ліра», дзейнасць якога накіравана на літаратурна-эстэтычнае і маральна-духоўнае выхаванне дзяцей і падлеткаў, якія праз высокае мастацтва жывапісу і музыкі вучацца разумець прыгажосць навакольнага свету;

- для маленькіх наведвальнікаў створаны лялечны тэатр «Бураціна», дзе ставяіша спектаклі па матьшах экалагічных твораў беларускіх пісьменнікаў.

Канвенцыя ААН і Закон Рэспублікі Беларусь «Аб правах дзяцей» заканадаўча замацоўваюць прыярытэт інтарэсаў дзяцей у фізічным і духоўным развіцці, права разумна арганізоўваць свой вольны час, удзельнічаюць у культурным жыцці грамадства і займацца творчасцю. Гэтыя правы належным чынам улічваюцца пры планаванні работы экалагічнай студыі «Вернісаж». Слуцкая гарадская дзіцячая бібліятэка была прызёрам абласнога экалагічнага конкурсу ў 2001 годзе, а ў 2008 годзе стала пераможцам IV абласнога агляда-конкурсу на лепшую



пастаноўку работы бібліятэк па экалагічнай асвеце і інфармаванні насельніцтва.

Секцыя студыі «Аз і букі экалагічнай навукі» разлічана на вучняў 1-4 класаў і дае першапачатковыя веды пра навакольную прыроду, жывёльны і раслінны свет планеты Зямля. Яна нясе ў сабе гуманістычную накіраванасць, якая праяўляецца ў беражлівых адносінах дзяцей да навакольнага свету, звычцы клапаціцца аб хатніх раслінах і жывёлах, і працуе па прынцыпе; экалагічныя веды — неабходная ўмова для гарманічнага суіснавання чалавека і прыроды. Бібліятэкары стараюцца знайсці незвычайныя формы работы са студыйцамі. Для маленькіх дзяцей вельмі важна ў кожны занятак уводзіць элемект гульні. Для іх распрацоўваюцца экагульні «Экалагічкае падарожжа па карце Беларусі» з віртуальным наведваннем розных мясцін рэспублікі. Гульня-падарожжа «Усё нам лета падарыла» паклікала дзяцей на прагулку ў гарадскі парк культуры і адпачынку. Малышы пазнаёміліся на практыцы з жывёльным (птушкі, насякомыя) і раслінным светам экалагічнага аб'екта Слуцка, сабралі гербарыі. Да Міжнароднага дня птушак быў арганізавамы экаўрок «На світанні, на зары ў зялёным гушчары» і аформлена музычная выстава «Птушыная ода порам года». На працягу года для чытачоў garталіся старонкі вуснага часопіса «З Несцеркам па родным краі», дзе дзеці праз гульні, віктарыны, шматлікія конкурсы знаёміліся з гісторыяй Бацькаўшчыны. На гульні-падарожжы «Край цудаў, казак і буслоў» па старонках кнігі Уладзіміра Ягоўдзіка «Сем цудаў Беларусі» ніводная вандроўка не была падобная на іншую. Разнастайнасць у мерапрыемства ўносілі аповеды дзяцей пра свае ўражанні ад наведвання з бацькамі і школьнымі экскурсіямі мясцін, апісаных у творы. Дзеці вельмі любяць розныя расліны і жывёл, асабліва яны неабыякавыя да сваіх хатніх выхаванцаў. Вельмі ўдалай атрымалася выстава-прэзентацыя для малышоў «Мой ласкавы і пяшчотны звер», дзе чытачы расказвалі пра сваіх любімцаў-катоў, іх характары, звычкі, прынеслі фотаздымкі сваіх выхаванцаў, малюнкі. Гучалі вершы, песні ў выкаканні дзяцей. Гэта мерапрыемства дало штуршок для аб'яўлення конкурсу на лепшы верш, казку ці аповед «Сказанне пра ката Мурлыку». Міждысцыплінавасць экалагічных ведаў з'яўляецца асновай для ўспрымання вучнямі

такіх навук, як біялогія, хімія, геаграфія і іншых, — вось галоўны прынцып работы секцыі. Заняткі носяць практычны характар з дапамогай інтэрактыўных і інфармацыйных метадаў. Выкарыстоўваюцца відэа- і мультымедыйныя матэрыялы, аўдыякасеты з гукамі прыроды. У студыі шырока адзначаюцца экалагічныя даты, падтрымліваюцца акцыі, што праводзяцца ў рэспубліцы. Экалагічны калейдаскоп “Зямля Беларусі” Вачыма азёраў глядзіш ты ў празрыстыя выді нябёс...», інфармацыйная замалёўка «Царства падводнага свету» былі прымеркаваны да Дня водна-балотных абшараў. Стварэнне гукавой экалагічнай газеты “Я і ты і ўсё наўкол» пазнаёміла студыйцаў з прыродай роднага краю, дапамога дзецям па-новаму зірнуць на звыклую мясцовасць для развіцця навыка выяўлення экалагічных праблем. На «Полі цудаў» дзеці знаёміліся з «Чароўным светам птушак». Не засталася ў баку і тэма Чарнобыля. У мінулым годзе на ўроку смутку «Чорны бусел — чорны цень» абмяркоўваліся пытанні экалагічнага стану Случчыны. Была арганізавана выстава «Жыццё пасля Чарнобыля». Да гэтай сумнай даты была прымеркавана раённая экалагічная акцыя «Табе і мне Зямля патрэбна», у якой наша студыя таксама прыняла самы актыўны ўдзел. У фае бібліятэкі выстаўлялася экспазіцыя малюнкаў і вырабаў з прыродных матэрыялаў «Супраць радыяцыйнай бяды — разам», дзейнічала выстава-напамін «Хай свеціцца імя Тваё, Беларусь!»

За 15 гадоў поўнасцю склалася структурная мадэль аб'яднання, акрэсліліся шляхі і напрамкі работы, стварылася свая адметная методыка правядзення заняткаў з дзецьмі. І ў той жа час студыя не стаіць на месцы, развіваецца, шукае новыя, інавацыйныя формы дзейнасці. З 500 студыйцаў, якія за гэты час прайшлі праз дзверы «Вернісажа», дзесьці чалавек 12-15 празаймаліся ў ёй якраз 15 гадоў, з першага па дзесяты клас, паступова пераходзячы з адной секцыі ў другую. Гэта вельмі радуе, паказвае, што студыя жыве, працуе, яна патрэбна дзецям. «Вернісаж» ператварыўся ў многафункцыянальны арганізм з секцыямі для заняткаў дзяцей розных узростаў і ро-набаковых інтарэсаў. За гады сваёй работы студыя не мяняла сваіх прыярытэтаў, але заўсёды старалася ісці ў нагу з часам, звяртаць увагу на самыя актуальныя пытанні. На секцыі «Саюз прыроды і мастацтва» дзеці праз жывапісныя, музычныя, літаратурныя вобразы вучацца разумець хараство роднай прыроды, любіць свой край. Аб'ява, якая запрашала наведаць літаратурна-музычны эцюд «Зялёная сімфонія», сабрала ў сценах бібліятэкі аматараў вершаваных радкоў і класічнай музыкі. Для самых маленькіх чытачоў студыйцы арганізавалі выступленне «Тэатра на стале» са спекгаклем-пацарожжам «Зямля — наш касмічны карабель». Наогул тэатральныя пастаноўкі, лялечныя спектаклі карыстаюцца ў нашых студыйцаў асаблівай увагай, бо ў кожным дзіцяці жыве акцёр. Паступова з агульнай колькасці дзяцей выдзелілася тэатральная група ў 7 чалавек, якія і займаюцца паказам экаспектакляў па матывах казак, твораў пісьменнікаў і па аўтарскіх сцэнарыях. Да апошніх адносяціш спектаклі «Урок прыроды з Васем Вясёлкіным», «Падарожжа па абрусе ў краіну Вітамінію». Што датычыцьтэатралізацыі літаратурных твораў, то ужо каторы год не сходзіць са сцэны спектакль па п'есе І. Сідарука «Кветкі падліўнем», які быў пераможцам абласнога конкурса сярод бібліятэчных лялечных тэатраў «Жывы свет лялек». У канцы мінулага года ў бібліятэцы адбылася прэм'ера спектакля па п'есе нашай зямлячкі Г. Каржанеўскай «Шукайце папараць-кветку» Гарадскога цэнтра дзіцячай творчасці. Да сустрэчы з беларускім пісьменнікам А. Зэкавым быў пастаўлены лялечны спекгакль па яго казцы «Гарбуз і яблыня». Кожнае лета мы праводаім «Баль кветак», касцюміраваныя ролі на якім выконваюць сябры студыі. Згодна праграме «Чытаем разам» ладзілі бібліятэчныя пікнікі «З кніжкай на лаўцы» і «Чытанне ў парку», дзе акрамя выязной бібліятэкі паказваліся лялечныя спектаклі, праводзіліся розныя інтэлектуальныя забавы. Удзельнікі экалагічнай акцыі здзейснілі захапляючае падарожжа па мультымедыйнай серыі энцыклапедычных слоўнікаў «Культура і мастацтва». Палотны рускіх мастакоў дэманстраваліся з дапамогай камп'ютэра. Творы А. Саўрасава «Гракі прыляцелі» і І. Шышкіна «Раніца ў сасновым лесе», многія карціны І. Левітана радавалі вока гледачоў.

«Творчая лабараторыя прыроды» — майстэрня, дзе прыродныя матэрыялы ператвараюцца ва ўмелых руках у сапраўдныя шэдэўры мастацтва. Прынцып работы секцыі наступны: экалагічныя веды — аснова для

развіцця творчых і інгэлектуальных здольнасцей дзіцяці. Пад назвай «Усмешка «сная прыроды» работы дзяцей выстаўляліся на шматлікіх гарадскіх і раённых мерпрыемствах. Да Сусветнага дня дзеянняў за забарону атамнай зброі была аформлена экспазіцыя з папяровых жураўлікаў-арыгамі, якіх дзеці выраблялі на працягу дня, папярэдне праслухаўшы інфармацыю пра трагічную падзею ў Хірасіме.

Усё вышэйсказанае дазваляе зрабіць наступны вывад: наша бібліятэка пашырае свой станоўчы ўплыў на юных случчан, уносіць сваю лепту ў справу духоўнага адраджэння, духоўнага аздараўлення нацыі праз любоў да прыроды, да ўсяго жывога на Зямлі, выкарыстоўваючы для гэтага розныя формы і метады бібліятэчнай работы.

***Галіна ШАХНОВІЧ,***
***загадчык Слуцкай гарадской дзіцячай бібліятэкі-філіяла № 3***

**Источник:** Планета-семья.-2009.-№2.-С.22-25.